**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Савецкая, 9,
220010, г. Мінск
тэл. 327-47-36, факс 200-84-83
E-mail: info@edu.gov.by

**МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Советская, 9
220010, г. Минск
тел. 327-47-36, факс 200-84-83
E-mail: info@edu.gov.by

20.12.2024 № 02-02-2672-кол-(э)-0/14042400001795
На № ____________ от ___________

[redacted]

[redacted]

У Міністэрстве адукацыі разгледжаны калектыўны электронны зварот па пытанні папулярызацыі беларускай мовы ва ўстановах дашкольнай адукацыі (далей – УДА) краіны. Паведамляем наступнае.

Згодна з артыкулам 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляюцца беларуская і руская мовы.

Артыкулам 50 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь устаноўлена, што кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць, карыстацца роднай мовай, а дзяржава гарантуе свабоду выбару мовы выхавання і навучання.

Рэалізацыя вышэйазначаных канстытуцыйных норм знайшла сваё развіццё ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1990 г. № 3094-XI «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь», Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (далей – Кодэкс).

Згодна з артыкулам 82 Кодэкса асноўнымі мовамі навучання і выхавання ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляюцца дзяржаўныя мовы Рэспублікі Беларусь. Дзяржава гарантуе грамадзянам права выбару навучання і выхавання на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь і стварае ўмовы для рэалізацыі гэтага права. Мова навучання і выхавання ва ўстанове адукацыі вызначаецца яго заснавальнікам. Заснавальнікамі УДА, як правіла, з’яўляюцца мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы (пункт 2 артыкула 20 Кодэкса).

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы фарміруюць групы УДА на падставе сацыяльнага заказу, жаданняў бацькоў (законных прадстаўнікоў) непаўналетніх, у заявах якіх вызначаецца мова навучання. Канчатковае рашэнне аб стварэнні груп прымаюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы.

Адукацыйны працэс ва УДА (групах) з беларускай мовай навучання і выхавання арганізуецца на беларускай мове. Выключэнне складаюць

гадзіны, адведзеныя на вывучэнне адукацыйнай галіны «Развитие речи и культура речевого общения» вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2022 г. № 229 (далей – вучэбная праграма дашкольнай адукацыі).

Ва УДА (групах) з рускай мовай навучання і выхавання, пачынаючы з другой малодшай (ад 3 да 4 гадоў), рэалізуецца змест адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, ва адукацыйны працэс уключаюцца розныя мерапрыемствы на беларускай мове (гульні (заняткі), экскурсіі, назіранні, азнаямленне з мастацкай літаратурай, у тым ліку з фальклорам, тэматычныя святы, вечарыны, гутаркі і іншае).

З мэтай стварэння максімальна спрыяльных умоў для развіцця маўленчых навыкаў, далучэння выхаванцаў да беларускай нацыянальнай культуры, паспяховасці фарміравання двухмоўя ствараецца камунікатыўнае асяроддзе, якое забяспечвае ўключэнне дзвюх моў у разнастайныя віды дзіцячай дзейнасці, а таксама правядзенне спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці са зместам вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі.

У мэтах шырокага інфармавання грамадскасці аб навучанні на беларускай мове УДА выкарыстоўваюць афіцыйныя сайты і рэгіянальныя сродкі масавай інфармацыі, праводзяць тлумачальную работу на бацькоўскіх сходах, у межах культурна-масавых і асветніцкіх мерапрыемстваў і інш.

Міністэрствам адукацыі, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, адміністрацыяй УДА вядзецца сістэмная тлумачальная работа сярод бацькоў (законных прадстаўнікоў) непаўналетніх, накіраваная на папулярызацыю беларускай мовы. Работа ў гэтым накірунку будзе працягнута і надалей.

Дадаткова паведамляем, што па пытанні папулярызацыі беларускай мовы ва ўстановах адукацыі краіны, у тым ліку УДА, Вам быў дадзены адказ ў лісце Міністэрства адукацыі ад 24.09.2024 № 02-01-1904-Кол-(0)-0/16022400000237.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Об обращениях граждан и юридических лиц» адказ Міністэрства адукацыі можа быць абскарджаны ў суд у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Начальнік Галоўнага ўпраўлення
агульнай сярэдняй і дашкольнай
адукацыі М.С.Кіндзірэнка

02-02 Гарэлава 200 14 82